кіх і асабістых запатрабаванняў вясковага насельніцтва. Для далейшага развіцця і ўдасканалення сучаснай культуры бяспрэчна важным з'яўляецца шырокае выкарыстанне народных традыцый у жыцці нашага грамадства. Усе ўзрастаючая цікавасць да нацыянальных форм культуры, да народных традыцый робяць вельмі вострым пытанне аб сучаснай прапагандзе нацыянальнага фальклору. У прыватнасці ў справе фальклорнай прапаганды, акрамя фальклорных фестываляў, канцэртаў, святаў народных спевакоў і выканаўцаў, неабходна больш шырокае выкарыстанне і сродкаў масавай інфармацыі: часцей арганізоўваць і перадаваць па радыё, тэлебачанню сустрэчы, інтэрв'ю, агляды-конкурсы фальклорных і фальклорна-этнаграфічных калектываў. Больш шырокае і актыўнае правядзенне масавых мерапрыемстваў па прапагандзе нацыянальнага фальклору безумоўна будзе садзейнічаць захаванню і ўдасканаленню народных традыцый.

## РЫНАК І САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНЫЯ ПРАБЛЕМЫ КУЛЬТУРЫ

А.У.Рак

Ва ўмовах пераходу да рыначнай эканомікі трэба адзначыць недасканаласць рынка сацыяльна-культурных даброт і паслуг, які фарміруецца ў сучасны перыяд.

Па-першае, па шмат якім відам культурных даброт і паслуг попыт перавышае прапанову.

Па-другое, захоўваецца манапалізаванае становішча многіх прадпрыемстваў і устаноў культуры ў адносінах да насельніцтва, да спажыўцоў культурных паслуг, што выяўляецца ў павышэнні цэн, у скарачэнні аб'емаў бясплатных паслуг.

Па-трэцяе, адсутнічае канкурэнцыя паміж вытворцамі. У галіне культуры прыстасаванне да спажывецкага попыта ажыццяўляецца вельмі марудна.

Між тым у рыначнай эканоміцы (і ў гэтым адна з яе пераваг) пакупнік вылучае свае патрабаванні да тавару, а вытворца павінен прыстасоўвацца да запатрабаванняў спажыўцоў, а не наадварот. Такім чынам, ажыццяўляецца разнастайнасць прапановы, або



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

"дэмакратыя выбару".

Вялікай перавагай рыначнай эканомікі з'яўляецца і тое, што рыначныя механізмы - попыт, прапанова, фарміраванне цэн - забяспечваюць вытворчу хуткую і дакладную інфармацыю аб патрабаваннях шырокіх слаеў насельніцтва. У адносінах аб'ектыўнасці і хуткасці ніякі другі спосаб атрымання інфармацыі - ці аналіз грамадскай думкі, або прагнозы спецыялістаў - непараўнальны з сігналамі спажывецкага попыта.

Становішча культуры ва ўмовах пераходу да рыначнай эканомікі трэба аналізаваць з пазіцый змянення крыніц не фінансавых сродкаў. У аснову новага падыходу к фінансаванню трэба пакласці прынцып разнастайнасці крыніц фінансавання культуры - мецэнацтва, спонсарства, а таксама самафінансаванне, калі насельніцтва, з'яўляючыся пакупнікам культурных даброт і паслуг, непасрэдна фінансуе іх стварэнне.

У Законе "Аб культуры ў Беларускай ССР" падкрэсліваецца, што дзяржава павінна выдзяляць на развіццё культуры не меньш 3% бюджэта. Такім чынам, патрэбна рацыянальнае спалучэнне бюджэтнага фінансавання і іншых форм, у тым ліку, і камерцыйнай дзейнасці устаноў культуры. Але рыначная сістэма сама па сабе непрыгодна для вырашэння такіх важных задач для грамадства, як ахова помнікаў культуры. Для гэтых мэт найбольш прыгодна форма дзяржаўнага фінансавання. Таксама рыначная сістэма не можа забяспечыць неабходныя сродкі і ўмовы для развіцця прагрэсіўных творчых напрамкаў культурнай дзейнасці. Для гэтых мэт неабходна спалучэнне рыначнай сістэмы фінансавання з якой-небудзь іншай формай (напрыклад, мецэнацтва). Але пакуль што магчымасці мецэнацтва абмяжоўваюцца існуючай сістэмай падаткаабкладання. У адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь "Аб падатках на даходы і прыбытак прадпрыемстваў, аб'яднанняў і арганізацый" прадпрыемствы іншых галін эканомікі могуць пералічваць на развіццё культуры грамадскім фондам не болей 1% абкладаемага прыбытку.

Пераход да рыначнай эканомікі немагчымы без значнага рэфармавання адносін уласнасці. У галіне культуры правамоцна існаванне ўсіх форм уласнасці. Між тым прыватызацыя ў галіне культуры павінна мець выбарачны характар. Аб'екты культуры пасля прыватызацыі патрэбна выкарыстоўваць строга па назначэнню.